Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2014-03-14

# Скідзель. Гісторыя




*Аўтар кнігі Сяргей Токць (справа) і выдавец Зміцер Санько.*

**У Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі адбылася прэзентацыя кнігі «Скідзель і яго ваколіцы. Жывая гісторыя» Сяргея Токця і Мікалая Дзелянкоўскага. Выданне стала прыкметнай падзеяй у культурным жыцці краіны.**

Да імпрэзы супрацоўнікі аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў бібліятэкі падрыхтавалі выстаўку «Скідзель: ад мінулага да сучаснага». Дакументы з сярэдзіны XIX ст. да нашага часу, манаграфіі, перыядычныя выданні, мемуарная літаратура, матэрыялы з фондаў беларускіх архіваў і іншыя сведчанні даўніны — усё гэта можна было пабачыць на ўласныя вочы.

Прэзентацыя распачалася выступленнем галоўнага рэдактара выдавецтва «Тэхналогія» Зміцера Санько, які адзначыў: «Чытач краязнаўчай літаратуры цяпер не той, што быў раней. Яго ўжо не задавальняюць павярхоўныя апісанні, «аздобленыя» высмактанымі з пальца легендамі, накшталт таго, што «пад гэтым 500-гадовым дубам адпачываў Іван Грозны». Сучаснага чытача цікавяць факты. Ён хоча таксама бачыць у гісторыі, хай сабе і лакальнай, сваіх дзядоў і прадзедаў. Выдатная кніга С. Токця і М. Дзелянкоўскага дае ў гэтым сэнсе вельмі багаты матэрыял. У ёй фігуруе больш як 600 прозвішчаў мясцовых жыхароў! Шмат каго, я ўпэўнены, яна падштурхне да складання свайго радаводу. Акрамя таго, аўтары кнігі паказваюць бліскучы прыклад сваім калегам — гісторыкам і краязнаўцам, у якім кірунку трэба працаваць і якога плёну можна дасягнуць».

Сяргей Токць, адзін з аўтараў кнігі, распавёў, як узнікла ідэя выдання, як рэалізоўваўся праект, азнаёміў прысутных з яго структурай і зместам. Адзначыў вялікае значэнне ў пашпаховай працы не толькі дзяржаўных кнігазбораў, архіваў, але і дзённікаў, успамінаў скідлян, а таксама сямейных фотаархіваў. Падзякаваў усім, хто дапамагаў у гэтай справе.

Дзве важныя акалічнасці адзначыў у сваёй прамове Аляксей Шаланда, кандыдат гістарычных навук: «Па-першае, гэтая кніга — выдатны прыклад супольнай працы гісторыкаў і краязнаўцаў. Па-другое, яна сведчыць, што гарадзенскія гісторыкі вельмі плённа працуюць. Радасна, што матэрыялы, якія яшчэ гадамі ляжалі б у архівах, не толькі ўвайшлі ў навуковы ўжытак, а і сталі даступныя шырокаму колу зацікаўленых чытачоў».

Андрэй Кіштымаў, дацэнт Інстытута прадпрымальніцтва і парламентарызму, акрэсліў: «У асобе Сяргея Токця мы маем аднаго з пачынальнікаў даследаванняў у галіне лакальнай гісторыі. Гэты кірунак надзвычай перспектыўны. Скідзелю пашэнціла, што ў яго ёсць свае Герадоты».

У аўтараў ёсць задума напісаць працяг гэтай кнігі — пра Скідзель ад 1939 года да нашых дзён.

**Наста КАПТУРЭЎСКАЯ**

Наста Каптурэўская. Скідзель. Гісторыя